Падтрымай "Вясну" на PATREON

Апазіцыянеры не патрапілі ў склад Магілёўскай абласной камісіі

22.05.2020 **Тэгі**: выбары-2020



Сумеснае пасяджэнне Магілёўскага аблвыканкаму і Прэзідыума Магілёўскага аблсавету дэпутатаў па стварэнні Магілёўскай абласной камісіі адбылося 19 траўня і прайшло без прадстаўнікоў палітычных партыяў, грамадскіх аб'яднанняў і СМІ. Выключэнне было зроблена для старшыні абласной арганізацыі АГП **Уладзіміра Шанцава** – паколькі ён сам быў вылучаны ў склад камісіі. Пра гэта піша сайт mspring.online.

У склад абласной камісіі былі вылучаныя **21 чалавек**, з іх два – прадстаўнікі апазіцыйных партый: **Уладзімір Шанцаў** ад АГП і **Дзмітрый Еўстратаў** ад БСДП "Грамада".

Усе вылучэнцы ў склад камісіі былі "папярэдне вывучаныя". Асноўнымі крытэрамі "вывучэння" былі: жыццёвы досвед, прафесійная і працоўная дзейнасць, досвед працы ў камісіях, узровень прадстаўніцтва грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партыяў у вобласці, іх пазнавальнасць і аўтарытэт у насельніцтва.

Праект рашэння быў загадзя падрыхтаваны яшчэ да галасавання, якое не прынесла нечаканасцяў – апазіцыянеры не трапілі ў склад камісіі. У іх дакументах чыноўнікі не ўгледзелі дадзеных пра досвед працы ў выбарчых камісіях, а ў Уладзіміра Шанцава – яшчэ і дакладны адрас пражывання. Між тым, у

пратаколе аб вылучэнні палітыка маецца і дакладны адрас, і дадзеныя аб працы ў выбарчай камісіі. Уладзімір Шанцаў мае намер абскардзіць рашэнне аб утварэнні камісіі ў судзе.

У склад Магілёўскай абласной камісіі па выбарах увайшлі 13 чалавек:

1. **Алекса Яўген**, начальнік аддзелу па працы з персаналам ААТ "АСБ "Беларусбанк" – ад Магілёўскай абласной арганізацыі прафсаюзу банкаўскіх і фінансавых работнікаў.
2. **Бяляева Марына**, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БРУ – ад Магілёўскага абласнога аддзялення ГА "Беларускі фонд міру".
3. **Берастаў Валерый**, пенсіянер – ад выбаршчыкаў шляхам падачы заявы.
4. **Гапееў Сяргей**, дырэктар Бялыніцкага філіялу "Аўтапарк №7" ААТ "Магілёўаблаўтатранс" – ад працоўнага калектыву.
5. **Громаў Анатоль**, начальнік Шклоўскага занальнага вузла электрасувязі Магілёўскага філіялу РУП "Белтэлекам" – ад працоўнага калектыву.
6. **Давыдаў Сяргей**, начальнік Крычаўкай дістанцыі пуці РУП "Магілёўскае аддзяленне Беларускай чыгункі" – ад выбаршчыкаў шляхам падачы заявы.
7. **Дашкевіч Ганна**, 2-гі сакратар Магілёўскага абласнога камітэту ГА "БРСМ" – ад Магілёўскай абласной арганізацыі "БРСМ".
8. **Жураўскі Сяргей**, начальнік Упраўлення землеупарадкавання Быхаўскага РВК – ад Магілёўскай абласной арганізацыі КПБ.
9. **Кароцін Мікалай**, дырэктар філіялу Белдзяржстраху па Магілёўскай вобласці – ад працоўнага калектыву.
10. **Макаранка Людміла**, пенсіянерка – ад Магілёўскай абласной арганізацыі ГА ветэранаў.
11. **Мартыноўскі Андрэй**, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу – ад Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу.
12. **Навумчык Анатоль**, дырэктар РУП "Бабруйскі ЦСМС" – ад Магілёўскай абласной арганізацыі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.
13. **Цімафеенка Дзмітрый**, кіраўнік справамі Адміністрацыі Кастрычніцкага раёну г. Магілёва – ад Магілёўскай абласной арганізацыі РГА "Белая Русь".

Шасцёра з нанаваабраных членаў уваходзілі ў склад Магілёўскай абласной камісіі падчас выбараў прэзідэнта ў 2015 годзе.

Акрамя не ўключаных апазіцыянераў, у склад камісіі не патрапілі пенсіянеры **Жана Аруцюнава** і **Віктар Гаршкоў**, галоўны спецыяліст Касюковіцкага РВК **Ала Канавалава**, спецыяліст ААТ "Круіз-аўта" **Аляксандр Макараў**, майстар вытворчага навучання Аўташколы "Фальксваген Аўтатраст Старт" **Валерый Марозаў** і таваравед Горацкага райспажыўтаварыства **Марына Падлужная**. Усе яны вылучаліся ад грамадзянаў шляхам падачы заявы.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Мужа і жонку з Дзяржынска асудзілі па групавым фотаздымку з акцыі пратэсту

Апазналі па відэа з дзіцём на руках. Экс-следчага і ягоную жонку асудзілі за ўдзел у акцыях пратэсту

У Мінску адразу пяці чалавекам прызначылі па году калоніі за ўдзел у акцыях пратэсту

Жыхарку Фаніпаля асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту з белай стужкай

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Мой статус быў "злосны парушальнік". Леанід Судаленка — пра зняволенне, ад'езд з Беларусі і салідарнасць

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)



ГАЛОЎНАЕ

Як пераследуюць беларусаў за камунікацыю з "экстрэмісцкімі" медыя



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява беларускіх праваабарончых арганізацый у сувязі з прызнаннем "Вясны" экстрэмісцкім фармаваннем

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жыхара Смалявіцкага раёна за ўдзел у нядзельным маршы пратэсту асудзілі да "хатняй хіміі"

"Маючы пры сабе атрыбутыку – сцяг бел-чырвона-белага колеру, выказваў свае грамадска-палітычныя погляды"

Супрацоўніцу БНТУ асудзілі па "народным" артыкуле за ўдзел у акцыях пратэсту

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Стаў вядомы прысуд вядомаму сталічнаму самелье Аляксандру Кульбачку

За абразу Лукашэнкі ў Мінску асудзілі кіроўцу

Баранавіцкага пенсіянера асудзілі за абразу Лукашэнкі і супрацоўніка міліцыі (далейшае)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY